УДК 82-1(476.5):821.161.3

**Т. А. Дубоўская,** кандыдат філілагічных навук
Віцебскі філіял установы адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Міжнародны ўніверсітэт “МІТСО”»,
вул. М. Шагала, 8а, 210015 Віцебск, Рэспубліка Беларусь, skryniatani@mail.ru

# МАСТАЦКАЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ВОБРАЗА ВІЦЕБСКА Ў БЕЛАРУСКАМОЎНАЙ РЭГІЯНАЛЬНАЙ ПАЭЗІІ

У артыкуле на прыкладзе беларускамоўных паэтычных тэкстаў, у тым ліку сеткавых, даследуюцца асноўныя вектары мастацкага асэнсавання вобраза Віцебска рэгіянальнымі творцамі. На аснове праведзенага даследавання можна сцвярджаць, што названы вышэй вобраз часцей за ўсё рэпрэзентуецца лірыкамі як: рэгіянальная каштоўнасць, што знаходзіць сваё ўвасабленне ў асаблівай духоўнай аўры гарадскога асяроддзя; сакральная поліканфесійная прастора са сваімі культавымі архітэктурнымі дамінантамі; адзін з самых старажытных гарадоў Беларусі са шматвекавым, часам драматычным, гістарычным мінулым; месца зліцця трох рэк — Заходняй Дзвіны, Віцьбы і Лучосы — сімвалаў жыцця, духоўнай сілы, спрадвечнай сувязі чалавека з прыродай; жыватворная крыніца натхнення і плённай працы для многіх айчынных і замежных культурных дзеячаў; запаветная радзіма сусветна вядомага мастака Марка Шагала.

**Ключавыя словы:** горад Віцебск; рэгіянальная паэзія; вобразны кампанент; семіятычны код; гідронім; культавая дамінанта; алюзія.
Бібліягр.: 17 назваў.

**T. A. Dubovskaya,** Ph. D. in Philology
Vitebsk branch of Higher Educational Establishment of the Federation of Trade Unions of Belarus
“International University «MITSO»”, 8a M. Chagall Str., 210015 Vitebsk, the Republic of Belarus,
skryniatani@mail.ru

# ARTISTIC REPRESENTATION OF THE IMAGE OF VITEBSK IN BELARUSIAN REGIONAL POETRY

The article explores the main vectors of artistic comprehension of the image of Vitebsk by regional masters of words (or authors) on the example of Belarusian-language poetic texts, including online (meaning texts posted on the Internet). Thus, on the basis of the study, it can be argued that the above image is most often represented by lyricists as: regional value, which is embodied in a special spiritual aura of the urban environment; the sacral polyconfessional space with its cult architectural dominants; one of the oldest cities of Belarus with a centuries-old, sometimes dramatic, historical past; the confluence of three rivers — Western Dvina, Vitba and Luchesa — symbols of life, spiritual strength, the primordial connection of man with nature; the invigorating source of inspiration and fruitful work for many domestic and foreign cultural figures; the cherished homeland of the world famous artist Marc Chagall.

**Key words:** the town Vitebsk; regional poetry; figurative component; semiotic code; hydronym; cult dominant; allusion.
Ref.: 17 titles.

**Уводзіны.** Вобраз Віцебска як каштоўнасці апісаны на матэрыяле публіцыстычнага (А. А. Лавіцкі «Медиаконцепты “Славянский базар” и “Витебск” в региональном газетном дискурсе», 2014), мовазнаўчага (В. А. Маслава «Гидроним Двина как ценность и концепт в языковом сознании жителей Витебщины», 2016; Г. М. Мезенка «Особенности ономастических фоновых знаний о Витебске у студентов-иностранцев», 2014; «Топонимная составляющая ассоциативно-культурного фона ойконима Витебск: структура, содержание», 2013), мастацтвазнаўчага (М. Г. Смоліна «Эстетизация образа родины в творчестве Марка Захаровича Шагала», 2018; А. В. Краўчанка «Марк Шагал в художественной культуре Беларуси:

© Дубоўская Т. А., 2024

Репозиторий БарГУ

фреймовое представление», 2014) і літаратуразнаўчага дыскурсаў. Што датычыцца апошняга, то Віцебск даследаваны ў пераважнай большасці на матэрыяле рускамоўных паэтычных тэкстаў. Так, духоўныя, прыродныя, культурныя, гістарычныя рэаліі Віцебска праз прызму творчасці рускамоўных паэтаў Беларусі разглядае А. Ю. Муратава ў артыкуле «Витебск как локальный текст» (2022). Спробе мадэлявання вобразаў «Віцебск» і «Уладзімір» на аснове рэгіянальных паэтычных тэкстаў прысвечана даследаванне А. А. Лавіцкага «Ценности-концепты “Витебск” и “Владимир” в региональном языковом сознании (на материале поэтического интернет-дискурса)» (2016). Функцыянальны спектр топаса Віцебска ў паэзіі сучасных рускамоўных лірыкаў Беларусі М. Бабарыка, М. Наменснікава, В. Мацкевіч, А. Асенчык, А. Сяшко аналізуецца ў артыкуле А. У. Крыклівец «Антология стихов о Витебске “Память города” как литературно-просветительский проект» (2021). Даследаванне вобраза малой радзімы ў творчасці М. Шагала, а таксама вобразаў, арыентаваных на культурна-гістарычнае мінулае Віцебска, знайшло адлюстраванне ў артыкулах В. А. Гучковай «Образ Витебска в стихотворениях Марка Шагала» (2021) і «Художественная модель города в творчестве русскоязычных поэтов Витебска» (2020).

Разам з тым вобраз Віцебска ў беларускамоўных творах рэгіянальных аўтараў практычна не даследаваны, хоць гэтыя творы валодаюць мастацкай вартасцю і могуць істотна дапоўніць існуючы лакальны тэкст.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Навуковае даследаванне праведзена на аснове дэскрыптыўнага і канцэптуальнага аналізу паэтычных тэкстаў, прысвечаных гораду Віцебску. Выкарыстаны фактычны матэрыял уключае беларускамоўныя вершы паэтаў Віцебскага рэгіёна, у тым ліку змешчаныя на разнастайных інтэрнэт-рэсурсах.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** У паэзіі рэгіянальных аўтараў горад нярэдка малюецца як асаблівая духоўная прастора. Апісваючы Віцебск, лірыкі акцэнтуюць увагу на сваёй непарыўнай духоўна-інтуітыўнай сувязі з ім як месцам, дзе непазбежна і назаўсёды застаецца душа. Пра гэта верш Вольгі Русілкі:

Гэты горад прарастае ў маім сэрцы
Нетаропка, неахвотна і навек.
Успамінамі, якія ўжо не сцерці,
І дэталямі дамоў, завулкаў, стрэх.
<…>
Над дамамі з вечара да рання
Піша Віцебск зноў сваё імя.
Быццам прызнаецца мне ў каханні.
Прарастаю ў гэты горад я [1, с. 129].

Як зазначае даследчыца С. С. Касаткіна, цэласнасць горада ўвасабляецца ў яго функцыянальным сэнсе, паколькі гэта месца, дзе людзі не проста жывуць, але і адчуваюць сваё прызначэнне, сутнасную важнасць акаляючага іх гарадскога асяроддзя. Архітэктурна-планіровачны комплекс, ландшафт мясцовасці, урбаністычная інфраструктура, ментальныя карты горада — усё гэта з’яўляецца паўнавартасным адзінствам прасторы ва ўяўленні гараджан [2, с. 104].

У кожнага чалавека, дзе б ён ні жыў, існуюць важныя, дарагія яму месцы, з якімі асацыюецца яго жыццёвая прастора. Маляўнічыя фрагменты прыроднага ландшафту, архітэктурныя асаблівасці са сваім сэнсава-каштоўнасным зместам выступаюць сродкам ідэнтыфікацыі асобы з месцам яе пражывання. Апошняе, безумоўна, уплывае на пачуцці, адчуванні, мысленне і паводзіны чалавека, робіцца неад’емнай часткай яго жыцця.

У працытаваным вышэй вершы *дамы*, *завулкі*, *стрэхі* са сваёй адмысловай архітэктурай, гісторыяй і культурнай семантыкай выступаюць ключавымі арыенцірамі ўспрымання і асэнсавання паэткай роднага горада. Глыбокая, узаемная повязь з Віцебскам адлюстравана

Рэпазіторый БарГУ

ў наступных метафарычных радках, якімі пачынаецца і якімі завяршаецца твор: *«Гэты горад прарастае ў маім сэрцы»*, *«Прарастаю ў гэты горад я»*.

Часам у вобразе Віцебска рэпрэзентуюцца асабістыя душэўныя перажыванні аўтараў, іх абагульненае суб'ектыўнае ўспрыманне навакольнай прасторы:

Горад ценяў, горад мрояў
Падказаў імклівы лёс.
У сюжэце новых роляў
Праглынула рэшткі слёз.
Горад шчасця?..
Не — спакою!
Горад думак?..
Не — разваг!
Пакахала сваю мрою,
І няхай жа будзе так! [3, с. 58].

*Горад ценяў*, *горад мрояў*, *горад спакою*, *горад разваг* — такія сімвалічныя іпастасі набывае Віцебск як адзін з важных этапаў у лёсе лірычнай гераіні Ірыны Лобан, як топас яе жыццёвага і творчага сталення.

З пазіцыі семіятычнага аналізу (аднымі з першых распрацоўшчыкаў структурна-семіятычнага метаду вывучэння літаратуры і культуры з'яўляюцца прадстаўнікі тартуска-маскоўскай семіятычнай школы Ю. М. Лотман, У. М. Тапароў, Б. А. Успенскі і інш.) горад разглядаецца як асобная семіятычная сфера, як лакальны тэкст культуры, дзе аб'ектам выступае гарадское асяроддзе, у якім дзякуючы рознага ўзроўню семіятычным кодам (тапаніміка, архітэктура, фальклор і інш.) адлюстраваны плён гістарычнага і культурнага жыцця.

Адной з важных знакавых сістэм, з дапамогай якіх ствараецца і фіксуецца тэкст горада, з'яўляецца семіётыка славутасцей — знакавая сістэма метаўзроўню, што выкарыстоўваецца для перадачы інфармацыі пра горад і аб'ядноўвае разам знакі розных семіётык (архітэктуры, ландшафту, гастраноміі і інш.). Так, усякая пабудова горада паўстае як знак, дзе план выражэння складае пэўная архітэктурная форма, а план зместу ўключае самыя разнастайныя звесткі: ад утылітарнага прызначэння да гістарычнай эпохі яе стварэння, імя архітэктара ці ўладальніка, асаблівасці стылю, гістарычных падзей або легенд, звязаных з канкрэтнай славутасцю [4, с. 136].

Па словах даследчыка М. А. Анісімава, кожны горад выступае тым локусам, гістарычна і культурна асвоенай прасторай, якая непарыўна прадуцыруе культурную інфармацыю. Таму існаванне горада ў часе абавязкова суправаджаецца знакавай рэпрэзентацыяй. Горад бесперапынна фарміруе ўнікальнае сімвалічнае поле са сваёй структурай і семантыкай [5, с. 34].

Духоўная сутнасць Віцебска ўвасоблена, безумоўна, і ў яго рэлігійнай гісторыі. Гэта горад, дзе здаўна мірна суіснавалі прадстаўнікі розных веравызнанняў — праваслаўныя, каталікі, іўдзеі і інш. Сёння Свята-Успенскі і Свята-Пакроўскі кафедральныя саборы, Свята-Васкрасенская і Благавешчанская цэрквы, касцёлы святой Барбары і Ісуса Міласэрнага, Вялікая Любавіцкая сінагога і сінагога «Шацёр Давіда» з'яўляюцца сакральнымі кодамі, культавымі дамінантамі Віцебска, што маюць унікальную гісторыю і культурную каштоўнасць і знаходзяць адлюстраванне ў творах многіх паэтаў. Пра гэта чытаем у вершы Наталлі Салаўёвай:

Горад, любімы мой Віцебск,
Ты мне мелодыі дорыш:
Плёскат знаёмы на Віцьбе,
Звонкі Шагалаўскі дворык.
Казачным святам запомніцца,
Яркім, прыгожым, як мары,



Репозиторий БарГУ

Белай Успенскаю звонніцай,
Стройным касцёлам Варвары [6].

Адметнай культавай дамінантай паўстае храм у вершы Уладзіміра Гардзейкі:

І ў цудоўнай царкве Благавешчання,
Што сама па сабе — хараство,
Зноў анёлам было абвешчана,
Што адбудзецца Ражджаство [7].

Аўтар, радкі якога цытуюцца ніжэй, не пакінуў свайго імені, аднак дадаў яркія дэталі да мастацкай панарамы Віцебска:

І, як дзіцячай намалёваны рукой,
Крывыя вулачкі сплятаюцца ў ніць;
Як карабель, сабор Успенскі над ракой
Ярчэй за сонца ў небе купалам блішчыць [8].

Як сцвярджае ў сваім вершы Яўгенія Букоціна-Ісупава, *«...недарэмна на гербе Хрыстос / Наш Віцебск ад нягод засцерагае!»* [9].

Адной з умоў асэнсавання Віцебска як прасторы духоўнай, сакральнай з'яўляецца, на думку паэткі, міжканфесійная талерантнасць:

Касцёлы, цэрквы велічна здаўна
Крыжы свае ў воблакі ўзносяць [9].

Віцебск — адзін з самых старажытных гарадоў Беларусі, які ва ўсе часы быў цэнтрам гандлёвых шляхоў. Ён узнік на месцы зліцця дзвюх рэк — Заходняй Дзвіны і Віцьбы, ад якой і атрымаў сваю назву. Невыпадкова вобраз Віцебска ў паэтычных тэкстах часта асацыюецца з гідронімамі Дзвіна, Віцьба і Лучоса, якія, на наш погляд, мэтазгодна аднесці найперш да сістэмы рэгіянальных каштоўнасцей. Тлумачыцца гэта ментальнай спецыфікай успрымання ракі як канкрэтнага локуса воднай прасторы, з якім непарыўна звязана гісторыя горада, у тым ліку яго легендарнае мінулае. Вось як спалучаны ўрбонім і гідронім у вершы Галіны Сіняковай:

Заснаваны даўно, побач з Віцьбай, Дзвіной,
І таму назва гэткая дадзена.
Шмат гадоў праплыло, Віцебск, па-над табой,
Шмат паданняў і казак тут складзена [10].

У радках, адрасаваных Віцебску, Яўгенія Букоціна-Ісупава сцвярджае:

На шчодрых мудрых хвалях да цябе Дзвіна,
Лучоса, Віцьба добры плён прыносяць [9].

Адзін з семіятычных кодаў Віцебска — манументальна-дэкаратыўная скульптура «Зліццё трох рэк», прысвечаная тром прыродным славутасцям Віцебска: Заходняй Дзвіне і яе прытокам Віцьбе і Лучосе. Яна ўсталявана ў 1987 годзе на месцы касцёла святога Антонія на вуліцы Леніна. Каскадны фантан з трыма алегарычнымі дзявочымі фігурамі, створаны скульптарам А. Н. Тарасянам і архітэктарам В. П. Андаралавым, сімвалізуе зліццё трох рэк.

У паэтычных радках Наталлі Салаўёвай горад на Віцьбе выступае знакам Радзімы:

Я прашу прабачэння, мой Віцебск,
Да цябе праязджаю я зрэдку.
Прывітанне, шаноўная Віцьба!
Прывітанне, чароўныя кветкі! [11, с. 89].



Рэпазіторый БарГУ

Настальгічныя ноткі гучаць і ў вершы Вальдэмара Калініна:

Наперад мчыцца скоры наш цягнік.
Нашто так мчацца і нашто спяшацца?..
За даляглядам родны горад знік —
Няўжо не давядзецца больш вітацца?
З мастамі, паркам, вулкамі, Дзвіной,
З умешкамі сваіх сяброў адданых?.. [12, с. 115].

Многія вершы паэтаў Віцебшчыны маюць глыбокую гістарычную аснову, якая пa-мастацку актуалізуецца ў паэтычных тэкстах. Згодна з афіцыйнай версіяй, Віцебск заснаваны ў 974 годзе кіеўскай княгіняй Вольгай. У Віцебскім летапісе XVIII стагоддзя Міхаіла Панцырнага і Стэфана Аверкі адзначаецца: «В лето 974 Ольга, победив ятвягов и печенегов, переправилась через реку Двину и с войском заночевала. Понравилась ей гора, и она основала деревянный замок, назвав его, от реки Витьбы, Витебском; построила в Верхнем замке каменную церковь святого Михаила, а в Нижнем — Благовещения и, пробыв два года, отправилась в Киев» [13, с. 94]. Аднак вядома, што княгіня Вольга памерла ў 969 годзе, таму не магла заснаваць Віцебск у 974 годзе. Некаторыя гісторыкі мяркуюць, што перапісчык у даце пераблытаў месцамі лічбы 4 і 7. У Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве захоўваецца наступная згадка пра Віцебск: «Оный город начало свое имеет от российской княгини Ольги, которая в 914 году проезжала в Киев через оное место и ночевала на горе, где и велела на той горе строить город, и по реке Витьбе назвав его Витебск» [13, с. 93]. Усе названыя вышэй версіі дакладна сведчаць толькі пра адно — распаўсюджанасць у Віцебску легенды пра княгіню Вольгу як заснавальніцу горада. Рэха гэтай легенды гучыць, у прыватнасці, у радках Тамары Красновай-Гусачэнка:

Па-над Віцебскам цераз вякі
Храм Успення бялюткі ляціць.
Вольга мудрая ўзмахам рукі
Загадала: «Тут гораду быць!» [14].

Паводле яшчэ адной мастацкай праекцыі гісторыі роднага краю, старажытны Віцебск

…сніць Княгіню, што ля берага плыла,
У промнях сонца набліжаліся чаўны… [8].

Жудасныя выпрабаванні зведаў горад у гады Вялікай Айчыннай вайны. Падчас акупацыі дзясяткі тысяч жыхароў горада былі знішчаны, сасланы ў Германію, закатаваны ў канцлагерах. 26 чэрвеня 1944 года зруйнаваны на 93 адсоткі Віцебск быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У ім засталося усяго 118 жыхароў [15]. Гэта балючая, незагойная рана:

Небасхіл у росквіце салютаў
Помніць жах ваенных бліскавіц.
Я ўсім сэрцам за цябе малюся
Да тваіх святыняў і званіц [8].

І ўсё ж, як канстатуе ў сваім вершы Галіна Сінякова,

Вораг колькі разоў спальваў і разбураў,
Толькі Віцебск зноў — зоркаю свеціцца! [10].

У Віцебску жылі, натхняліся і шчыравалі славутыя культурныя дзеячы: мастакі Юдаль Пэн, Лазар Лісіцкі, Васіль Кандзінскі, Казімір Малевіч, Марк Шагал, Ілья Рэпін, Іван Хруцкі, скульптар Сяргей Селіханаў, фалькларыст і этнограф Еўдакім Раманаў і многія інш. У горадзе

Репозиторий БарГУ

неаднаразова бывалі, а потым узгадвалі яго ў сваіх творах вядомыя беларускія пісьменнікі Ніл Гілевіч, Еўдакія Лось, Рыгор Барадулін, Уладзімір Караткевіч і інш. Гэтыя і іншыя славутыя постаці паўстаюць у радках Наталлі Салаўёвай:

Хруцкі нас творамі лечыць:
Дыхаюць праўдай карціны.
Пэн, Марк Шагал і Малевіч
Нас запрашаюць гасцінна.
Тут пабываў Селіханаў.
Рэпін праславіў Здраўнёва.
Песні збіраў тут Раманаў.
Лось прысвячала нам словы [6].

Асобнай увагі заслугоўвае палымяны патрыёт Беларусі Уладзімір Караткевіч, якога ў адметным лірычным аповедзе згадвае Людміла Сіманёнак:

Надвячоркам згасаюць крокі.
Падміргнуўшы цішком наўкол,
Саступае на дах з аблокаў —
Каб у скрыпку зайграць — анёл.
Адвярнуўшыся нечакана,
Караткевіч ў руку дыхне:
Як, паводле найноўшых планаў,
Быць пад дрэвам яму ці не? [16, с. 76].

Асабліва часта ў рэгіянальным паэтычным дыскурсе Віцебск асацыюецца з імем мастака-авангардыста Марка Шагала, які сваёй творчасцю праславіў горад на ўвесь свет. Так гучаць радкі беларускага рускамоўнага паэта Давіда Сімановіча ў перастварэнні Рыгора Барадуліна:

І Шагал, як біблейскі Адам,
мовіў сумна, з жыццём развітваючыся:
«Засталася душа мая там…»
Зноў зрабіліся вочы блакітнымі.
<…>
Незабыты ўсміхаецца край
даваеннай Дзвіной незахмаранай.
І крычу я праз пекла, праз рай:
«Дык з вяртаннем Вас, Марк Захаравіч!» [17, с. 86].

Часам вобраз Віцебска малюецца паэтамі праз алюзіі на вядомыя творы мастака («Над горадам», 1914—1918; «Чырвоны конь», 1967), напоўненыя містыцызмам, сімволікай і асаблівай духоўнасцю. Як напісаў вышэйзгаданы аўтар:

І ступаюць забытыя сны
па зямлі, спавітай дарогамі.
З Бэлай светла лятуць яны
па-над цэрквамі, сінагогамі [17, с. 86].

Гэты ж вобраз натхніў і Галіну Сінякову:

Закаханы дуэт над Зямлёю ляціць —
Ад Шагала — у высі чароўныя! [10].

Репозиторий БарГУ

Віцебск — Шагал — каханне — натхненне. Па-свойму спалучае гэтыя мастацкія дамінанты кожны з паэтаў:

Здаецца Віцебску, што зноў жыве Шагал
І закаханыя глядзяцца ў сінь нябёс.
Натхненне майстру горад шчыра аддаваў —
Мастак звязаў навек з ім неразрыўна лёс [8].

Менавіта правінцыйны Віцебск стаў тым страчаным раем, той запаветнай радзімаю, пра якую Мойша Сегал (так мастака назвалі пры нараджэнні, імя Марк Шагал ён атрымаў у Парыжы ў 1910 годзе) заўжды памятаў, але куды так і не змог вярнуцца. Успаміны пра Віцебск, увасобленыя ў жывапісных мастацкіх вобразах, вярталі творцу ў маладосць, натхнялі, духоўна ўмацоўвалі. Сярод мноства сюжэтаў, да якіх звяртаўся Марк Шагал, асабліва вылучаюцца тыя, што звязаны з родным горадам. Непарыўнасць гэтай сувязі тонка падкрэслена Давідам Сімановічам:

Ёсць мяжа жыцця і пакут,
неўміручасць узнагародаю…
Засталася душа яго тут
неразгаданая, першародная [17, с. 86].

Багатай асацыятыўнасцю, вобразнасцю, алюзійнасцю вылучаецца верш Вальдэмара Калініна, прысечаны славутаму земляку:

…ты смела выпусціў, Шагал,
Высока коней пасвіцца ў нябёсах,
Паны злуюць, імчацца цыганы
Наўскач каля галоў, на розум босых.
А будуць коні вольныя ляцець,
І вырai вяртацца па-над хатай,
І віцебскае неба дух яго
Вітацьме думкай і душой крылатай [12, с. 115].

Безумоўна, у многіх паэтычных творах культурныя знакі Віцебска пераадольваюць межы рэгіянальных каштоўнасцей. Так, у радках ужо цытаванага намі невядомага аўтара старажытная гісторыя паядноўваецца з сучасным днём Віцебска, падкрэсліваецца месца горада ў культурнай парадыгме славянскіх народаў:

Па тваіх праспектах вольна крочу,
Горад старажытны над Дзвіной.
Віцебск фестывальны, Віцебск творчы,
Ганаруся я гісторыяй тваёй! [8].

Краінай мастацтваў, сталіцай майстроў называе родны горад Наталля Салаўёва. У вершы Галіны Сіняковай спалучаюцца канцэпты, топасы, каштоўнасці, якія выступаюць эфектыўнымі сродкамі мастацкай рэпрэзентацыі сучаснага Віцебска:

У Віцьбу Ратуша глядзіцца,
Як у люстэрка, — з даўніны,
Натхненню мастакоў — крыніца —
У водах Віцьбы і Дзвіны,
Святлом Славянскага базара
Збірае Беларусь сяброў,
Няхай мінаюць горад хмары,
Красуй наш Віцебск — зноў і зноў! [10].

Рэпазіторый БарДУ

**Заключэнне.** У беларускамоўнай творчасці паэтаў Віцебшчыны горад на Дзвіне асэнсоўваецца як: 1) рэгіянальная каштоўнасць, што выяўляецца ў асаблівай духоўнай аўры горада; 2) сакральная поліканфесійная прастора са сваімі культавымі архітэктурнымі дамінантамі; 3) адзін з самых старажытных гарадоў Беларусі са шматвекавой, часам драматычнай гісторыяй; 4) адметны ландшафтны феномен і сімвал спрадвечнай сувязі чалавека з прыродай, жыцця і духоўнай сілы — месца зліцця Заходняй Дзвіны, Віцьбы і Лучосы; 5) адмысловая культурніцкая тэрыторыя, жыватворная крыніца натхнення і плённай працы для многіх айчынных і замежных творцаў; 6) далёкая, запаветная радзіма сусветна вядомага мастака Марка Шагала.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Дзвіна. Віцебшчына літаратурная : альманах / укл. Т. І. Краснова-Гусачэнка. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2017. — Вып. 6. — 544 с.
2. *Касаткина, С. С.* Семиотический подход к исследованию города как системы / С. С. Касаткина // Философ. мысль. — 2017. — № 6. — С. 101—110.
3. *Лобан, І.* Мая душа / І. Лобан. — Мінск : І. П. Логвінава, 2011. — 120 с.
4. *Медведева, Е. В.*Семиотика достопримечательностей и ее роль в формировании текста города / Е. В. Медведева // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 19, Лингвистика и межкультурная коммуникация. — 2020. — № 4. — С. 134—142.
5. *Анисимов, Н. О.* Город в дискурсе семиотики / Н. О. Анисимов // Juvenis scientia. — 2018. — № 12. — С. 33—35.
6. Падарожжа па старажытным горадзе Віцебску [Электронный ресурс] // Стихи.ру. — Режим доступа: https://stihi.ru/2017/06/15/7689 . — Дата доступа: 10.11.2023.
7. Беларуская паэзія: вершы на беларускай мове [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belarusy.net/uladzimer-gardzejka/ya-paudnya-vandravau-pa-vicebsku/ . — Дата доступу: 10.11.2023.
8. Варыянты гімна Віцебска загучаць з дынамікаў на плошчах горада [Электронны рэсурс] // Навіны Віцебска. — Рэжым доступу: https://viciebsk.by/2011/03/04/varyiyantyi-gimna-vitsebska-zaguchats-z-dyinamikaw-na-ploshchah-gorada/ . — Дата доступу: 10.11.2023.
9. Стихи о Витебске [Электронный ресурс] // Livejournal. — Режим доступа: https://slavar64.livejournal.com /142208.html . — Дата доступа: 09.11.2023.
10. Галина Синякова [Электронный ресурс] // Стихи.ру. — Режим доступа: https://stihi.ru/avtor/singal63 . — Дата доступа: 09.11.2023.
11. *Соловьёва, Н.* На перекрестке звезд и судеб: лирика / Н. Соловьёва. — Минск : Медисонт, 2013. — 213 с.
12. Ратуша : літаратурны альманах / рэд. А. П. Лазебная. — Мінск : Кнігазбор, 2017. — Вып. 3. Віцебск. — 191 с.
13. Витебская старина : в 5 т. / сост. А. П. Сапунов. — Витебск : Тип. губерн. правления, 1883. — Т. 1. — 668 с.
14. Гимн Витебска [Электронный ресурс] // Витеб. город. исполн. ком. — Режим доступа: https://vitebsk.gov.by/ru/economic-ru/ . — Дата доступа: 09.11.2023.
15. История Витебска [Электронный ресурс] // Свободная энциклопедия «Википедия». — Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/История_Витебска . — Дата доступа: 08.11.2023.
16. Ратуша : літаратурны альманах / рэд. А. П. Лазебная. — Мінск : Кнігазбор, 2018. — Вып. 4: Віцебск. — 239 с.
17. *Сімановіч, Д.* Я маю гонар сынам быць… / Д. Сімановіч // Полымя. — 2018. — № 6. — С. 86—89.


Паступіў у рэдакцыю 27.11.2023.

Репозиторий БарГУ